Министерство культуры Республики Беларусь
Белорусский государственный университет культуры и искусств

# НАУЧНЫЙ ПОИСК В СФЕРЕ СОВРЕМЕННОЙ КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВА

*Материалы научной конференции
профессорско-преподавательского состава
Белорусского государственного университета культуры и искусств,
посвященной Году качества
(Минск, 21 ноября 2024 г.)*

Минск
БГУКИ
2025

УДК 316.7+7
ББК 7я431+85я431
Н 347

Редакционная коллегия:
*Н. В. Карчевская, Е. Е. Корсакова, Ю. Н. Галковская, Е. В. Пагоцкая, Н. Е. Шелупенко*

Рецензенты:
*М. Л. Цыбульский,* кандидат искусствоведения, доцент,
*Е. В. Голикова-Пошка,* кандидат искусствоведения, доцент

Н347 **Научный поиск** в сфере современной культуры и искусства : материалы науч. конф. профессорско-преподавательского состава БГУКИ, посвященной Году качества, Минск, 21 нояб. 2024 г. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: Н. В. Карчевская [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2025. – 556 с.
ISBN 978-985-522-394-9.

Представлены материалы научной конференции профессорско-преподавательского состава, посвященной Году качества. Ее участники обсудили достижения за 25 лет существования белорусской культурологической школы и перспективы ее развития, рассмотрели опыт сохранения, трансляции, репрезентации историко-культурного наследия, информационные технологии в культуре, традиции и новации в межкультурной коммуникации и диалоге культур и многие другие вопросы.

Адресуется преподавателям учреждений образования сферы культуры, научным работникам, студентам, а также широкому кругу читателей.

**УДК 316.7+7**
**ББК 7я431+85я431**

**ISBN 978-985-522-394-9**

© Учреждение образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», 2025

# СОДЕРЖАНИЕ

## ПЛЕНАРНЫЕ ДОКЛАДЫ

*Соколова О. М.* Культурологическая школа Беларуси: истоки, реалии, перспективы ........................................................ 9

*Николаева Ю. Г.* Жанровое разнообразие эстрадно-циркового искусства на белорусской эстраде советского периода ................. 18

## Круглый стол Здабыткі і перспектывы развіцця беларускай культуралагічнай школы: да 25-годдзя заснавання

*Смолик А. И.* Аксиология как проблемное поле отечественной культурологии: становление и развитие .................................. 25

*Масленченко С. В.* Этапы развития цифровой культуры и ее цифровизации ......................................................................... 32

*Никонович Н. А.* Религиоведение и культурология как важнейшие составляющие гуманитарного знания .................................... 37

*Коваленя Е. Г.* Исследование геокультуры города как области научного знания в белорусской культурологии ......................... 41

*Усовская Э. А.* Культурология и культурные исследования как фундаментальное и прикладное направления ......................... 49

*Белакурскі В. М., Белакурская Ж. Я.* Феномен архетыпу ў філасофска-культуралагічным разуменні ...................................... 52

*Криштаносова Е. А.* Этнические традиции в контексте современного диалога культур: консервация и трансляция ....................... 56

*Сухоцкая Т. Ф.* Культуралагічнае асэнсаванне мастацкай літаратуры ......................................................................... 59

*Карнажицкая Т. В.* Гуманитарно-эстетический потенциал современного культурного пространства Беларуси .......................... 64

*Соколовская М. М.* Ценности традиционной китайской культуры .. 68

*Самосюк Н. В.* Социокультурные связи русской православной церкви и православной церкви Западной Беларуси в межвоенный период ......................................................................... 73

*Шелег Е. А.* Инклюзивное культуротворчество в информационной эпохе: возможности и вызовы ........................................ 77

*Михалёва Е. А.* Интерпретация понятия «традиционные семейные ценности» в социально-гуманитарном дискурсе ......................... 82

*Молдованова Е. С.* Междисциплинарный подход к изучению культуры детства ......................................................... 86

*Пилипенко К. А.* Специфика создания молодежных центров на базе креативных пространств …………………………………….. 91
*Ду Бикунь.* Традиции дворцовой системы питания в Китае ……… 94
*Кузьменчук И. В.* Особенности формирования национальной культуры в системе идентичности нации: культурологический аспект …... 100
*Ли Сюэсинь.* Коннотация образа яйца в восточных космогонических мифах ………………………………………………………… 104
*Лу Ся.* Бурлеск как жанр традиционных уличных представлений Сычуани ………………………………………………………………… 108
*Чжун Цяньцянь.* Влияние западной традиции на китайскую философию ……………………………………………………………… 113

## Секция 1
## Актуальные проблемы теории и истории искусства

*Пагоцкая Е. В.* Сценическое пространство Беларуси: историко-культурный аспект ………………………………………………… 119
*Шаройко Е. Н.* Фреска в художественном решении фильма …….. 124
*Петухова Н. В.* Метад рэканструкцыі ў распрацоўцы і ўвасабленні традыцыйнага абраду ……………………………………………... 129
*Стельмах А. М.* Современные стратегии позиционирования деятельности театра ……………………………………………………... 132
*Трапянок У. А.* Генезіс і сучаснае развіццё паэтычнага радыётэатра Беларусі …………………………………………………………….. 137
*Чжан Яньпен, Трепенок В. А.* Влияние заимствованных программ на современное телевидение Китая на примере постановочного проекта «Слава Богу, ты здесь» ……………………………………….. 145
*Николаева Ю. Г.* Роль деятельности концертных бригад в развитии эстрадно-циркового искусства в Беларуси советского периода ... 149
*Грищенко А. Б.* Пленэры по живописи как способ сохранения и популяризации архитектурного наследия Беларуси ……………….. 156
*Коршук А. Н.* Музыкальное направление классический кроссовер в массовой культуре Беларуси и России: специфика и формы проявления …………………………………………………………………….. 161
*Беспалая А. А.* Арт-парк «Никола-Ленивец» как способ художественного освоения природного пространства …………………….. 165
*Гу Юйши.* Стилистические особенности жанра сяншэн ………….. 173
*Су Жунцзи.* Актуальные проблемы современного театрального образования (на примере подготовки актеров в Беларуси первой четверти XXI в.) ……………………………………………………… 177
*Сюй Цзинань.* Поэтичность в живописи Марка Шагала ………….. 181
*Чжан Цзыхань.* Развитие детского театра в Китае ……………….. 189
*Чэнь Вэнь Вэнь.* Современное состояние театрального любительского искусства в Беларуси ……………………………………….. 193

*Ян И.* Исследование выставок китайских музеев в условиях цифровизации ........................................................................ 197
*Смирнова И. А.* Национальные тенденции развития белорусского джаза первой четверти XXI в. ............................................... 201
*Бортновский В. В.* Выдающиеся личности в мировой истории дирижерского исполнительства: Густав Малер (1860–1911) ……….. 208
*Федоров А. В.* Искусство дирижирования как самостоятельный вид музыкального творчества ……………………………………….. 212
*Довжик Е. Н.* Формирование современного духового оркестра в зарубежной музыкальной культуре XX в. ………………………... 219
*Сергеева О. О.* Творческий портрет Анри Брода и его вклад в развитие французской исполнительской школы игры на гобое ……….. 225
*Поляков Г. Г.* Сценическая интерпретация электронной танцевальной музыки: определение и содержание понятия ……………….. 229
*Пуш С. В.* Формирование исполнительских навыков в классе струнного ансамбля ……………………………………………………….. 234
*Белан А. И.* Специфика формирования знаний, умений и навыков эстрадно-джазовой манеры исполнительства (в контексте истории традиционного и прогрессивного современного сольного исполнительства пианистов) ……………………………………………………….. 240
*Домненкова Л. В.* Формообразование и декорирование европейского фаянса и фарфора эпохи барокко ……………………………….. 247
*Кривошеева С. В.* Тенденции развития народного изобразительного искусства в современном художественном пространстве Беларуси ………………………………………………………………………. 253
*Мицкевич А. Г.* Из опыта исследований и презентаций многообъектных произведений искусства ………………………………... 257
*Васюк Т. І.* Мастацтва як форма ўдасканалення асобы …………… 261
*Шатило Е. В.* Особенности экспонирования декоративно-прикладного искусства в контексте современной выставочной деятельности ……………………………………………………………………... 266
*Лінькова Н. А.* Рэпрэзентацыя каштоўнасцей традыцыйнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў сучаснай выставачнай прасторы … 271
*Ван Юекай.* Влияние маньчжурских мифов о сотворении мира на искусство масок ……………………………………………………… 276
*Ши Сюефэн.* Искусство традиционной китайской керамической посуды ……………………………………………………………………... 281
*Ши Сюефэн.* Мебельное искусство традиционного китайского дома ……………………………………………………………………… 284
*Дожина Н. И.* Специфика организации аудиторной работы по сольфеджио со студентами факультета музыкального и хореографического искусства ……………………………………………………… 287
*Ухова И. В.* Жанровые средства музыкальной выразительности: научный и педагогический аспекты ……………………………………… 292

*Ходинская Н. Н.* Звуковой материал музыки XX–XXI вв. в курсе современной гармонии ........................................................ 297
*Лойко О. Б.* Содержательно-методические аспекты преподавания дисциплины «Элементарная теория музыки» для иностранных студентов .......................................................................... 303
*Чжан Цзобинь.* Музыкальное образование Китая до 1911 г.: историко-теоретический аспект ............................................. 308
*Кожемяко Д. А.* Слово как нетипичный компонент хореографического произведения ....................................................... 312
*Бодунова И. И.* Старинные бальные танцы: исторический и современный аспекты ........................................................... 320
*Ковальчик И. В.* Развитие белорусской народно-сценической хореографии периода «нулевых» ......................................... 325
*Навроцкая О. А.* Антуражная хореография Беларуси: характеристика развития на современном этапе .................................... 330
*Столяр О. Н.* Актуальные методические рекомендации при проведении занятий по дисциплине «Европейская и латиноамериканская программа» ......................................................... 334
*Фань Чжунтао.* Применение повседневных артефактов как сценического реквизита в искусстве китайского танца ..................... 338
*Гажевская-Пешак Т. С.* Пейзажная лирика в хоровом творчестве Н. Литвина (на примере хорового цикла «Родныя вобразы») .......... 342
*Войтик С. Ф.* Локальные типы многоголосия в традиционной песенной культуре Понемонья .............................................. 348
*Волынец Е. Н.* Современные формы популяризации гармони в музыкальной культуре Беларуси ........................................... 354
*Баранова Н. В.* Некоторые аспекты развития музыкально-образного мышления у студентов хоровой специализации посредством фортепианных переложений оперно-симфонической музыки ......... 359

## Секция 2
## Историко-культурное наследие: опыт сохранения, трансляции и репрезентации

*Бамбешка І. І.* Мемарыялізацыя асобы музейнымі сродкамі: да пытання аб фарміраванні тэрміна «мемарыяльны музей» ........... 364
*Зимина М. В.* Понятие превентивной консервации в современной музеологии ............................................................................ 370
*Наумова Е. Г.* Технологии искусственного интеллекта как инструмент сохранения историко-культурного наследия Беларуси ...... 374
*Ли Пэн.* Трансляция традиционной китайской медицины в мировое пространство ................................................................... 382

## Секция 3
## Информационные технологии в культуре: новации и перспективы развития

*Жилинская Т. С., Якимович В. С.* Геймификация обучения: сущностные характеристики и специфика ее реализации при подготовке менеджеров-культурологов ................................................. 387
*Жилинская Т. С., Бачурина Т. В., Кунцевич О. М.* Цифровая культура как драйвер трансформации личности ............................... 393
*Федосова А. А.* Стратегия цифрового продвижения учреждения культуры как инструмент планирования рекламной деятельности … 398
*Руткевич С. А.* Искусственный интеллект в искусстве: основные тенденции развития и перспективы дальнейшего применения ........ 404
*Гончарик Н. Г., Серегина Л. А.* Особенности современных цветовых пространств и технологий мониторов ............................ 408
*Бовбель Е. В.* Исследование феномена послушания и ответственности с помощью анализа больших данных сферы культуры ......... 414

## Секция 4
## Межкультурные коммуникации и диалог культур: традиции и новации

*Макаревич А. В.* Тренд в пространстве социокультурной коммуникации: трактовка понятия и проблема идентификации ........... 419
*Шаймерденова С. К.* Всемирные игры кочевников – международный символ дружбы и культурного обмена ............................... 423
*Кузнецова Е. В.* Культурный код: определение и особенности проявления в современном рекламном дискурсе ........................ 429
*Смоликова Т. М.* Инновационные подходы к рекламным коммуникациям на основе AI-технологий .................................... 435
*Лебедева Д. В.* Стереотипы и предрассудки в межкультурной коммуникации ........................................................... 442
*Рунцо Д. В.* Корпоративная культура и межкультурные коммуникации: нравственно-этические проблемы .................................. 448

## Секция 5
## Библиотечно-информационная деятельность в системе культурно-образовательного потенциала социума

*Галковская Ю. Н.* Актуальные проблемы совершенствования содержания библиотечно-информационного образования ............. 452
*Зыгмантович С. В.* Формирование профессиональных компетенций будущих библиотечных специалистов для реализации социально-культурных функций ............................................ 459
*Козленко Е. Ю.* Понимание студентами сущности и возможностей профилизации «Аналитика» ........................................ 466

*Политевич Е. Э.* Создание и распространение профессионального цифрового библиотечного медиаконтента ........................ 471
*Гладырева Н. А.* Применение технологии проблемного обучения для развития критического мышления студентов при обеспечении медиабезопасного поведения в информационном пространстве ....... 478
*Ткаченко А. С.* Активное чтение как нестандартный способ прочтения художественной литературы ........................................ 483

## Секция 6
## Педагогика социально-культурной деятельности: современные формы и пути развития

*Шелупенко Н. Е., Шаколо А. В.* Патриотизм как детерминанта развития национального культурного пространства Беларуси ......... 491
*Ушакова В. М.* Основные аспекты развития инновационной педагогики на современном этапе ........................................... 496
*Казлоўская Л. І.* Сучасныя падыходы да класіфікацыі культурнадасугавых праграм ........................................................ 503
*Самерсова Н. В.* Теоретико-практические основы педагогического моделирования социально-культурной деятельности детей и молодежи ................................................................ 508
*Цыркун Н. А.* Стихотерапия как метод развития творческих способностей и научного мышления специалистов сферы культуры ... 512
*Цыркун И. И.* Психологический анализ представлений слушателей ИПКиПК об учителе начальных классов и о специалисте сферы культуры ........................................................ 517

## Секция 7
## Белорусская и зарубежная филология: особенности и инновационные формы изучения в учреждениях высшего образования сферы культуры и искусства

*Пісарэнка А. М.* Тыпалогія вобразаў і вобразнасці мастацкага тэксту (да юбілею паэта Міколы Шабовіча) ............................ 523
*Клімаў І. П.* Тэматыка і кампазіцыя прадмовы Сымона Буднага да Нясвіжскага катэхізіса 1562 г. ........................................... 529
*Тычына С. М.* Тыпалогія вобраза героя «свой сярод чужых, чужы сярод сваіх» у рамантычнай літаратуры XIX ст. і сучаснай літаратурнай казцы (на прыкладзе творчасці Д. Ф. Купера і Д. Роўлінг) .... 535
*Безмен С. Г.* Использование технологии «warming up» при обучении английскому языку студентов неязыкового вуза .................. 542
*Влазнюк Н. И.* К вопросу об определении понятия «мир музыки» ... 547
*Попова Д. Б.* Эссе как способ реализации письменно-коммуникативной компетенции в контексте иноязычного профориентированного обучения ...................................................... 550

крепить существующую для него приемлемую позицию, несколько ее изменить (если имеется необходимость укрепления имиджа театра или расширения его целевой аудитории) либо попытаться дистанцироваться от конкурентов, сфокусировавшись на четко определенных потребительских группах. Тем самым позиционирование сегодня является недорогим и эффективным инструментом продвижения и популяризации деятельности театра и может меняться в зависимости от его целей и состояния рынка. Концентрируясь на работе организации в целом или акцентируя внимание на конкретном спектакле или исполнителе, маркетинг театра при выборе позиции все равно ориентирован на потребителя и его ценности, что в перспективе может принести прибыль и позволить занять доминирующее положение на рынке.

1. *Котлер, Ф.* Все билеты проданы: стратегии маркетинга исполнительских искусств / Ф. Котлер, Д. Шефф. – М. : Классика–XXI, 2012. – 688 с.

2. *Станиславский, К. С.* Мое гражданское служение России. Воспоминания. Статьи. Очерки. Речи. Беседы. Из записных книжек / К. С. Станиславский ; сост., вступ. ст. и коммент. М. Н. Любомудрова. – М. : Правда, 1990. – 656 с.

3. *Шереметьева, Е. Н.* Позиционирование в прямом маркетинге / Е. Н. Шереметьева // Вестн. Воронежского гос. ун-та. Серия: Экономика и управление. – 2005. – № 1. – С. 71–77.

4. *Шереметьева, Е. Н.* Стратегия позиционирования в прямом маркетинге / Е. Н. Шереметьева // Российское предпринимательство. – 2007. – № 6. – С. 126–130.

УДК 7.096+792.096(476)

***У. А. Трапянок,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

## ГЕНЕЗІС І СУЧАСНАЕ РАЗВІЦЦЁ ПАЭТЫЧНАГА РАДЫЁТЭАТРА БЕЛАРУСІ

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны станаўленню паэтычнага радыётэатра Беларусі ў 1920-я гг., яго далейшаму развіццю пад уплывам

тэхналагічнага ўдасканалення дзяржаўнага радыё, выяўленню асаблівасцей функцыянавання аўдыяльнай з'явы з вершаванай літаратурнай асновай на сучасным этапе. Асноўная ўвага звернута на фарміраванне і запатрабаванасць у розныя перыяды жанраў «паэтычная радыёкампазіцыя» і «радыёспектакль». Прыведзены факталагічны матэрыял пашырае ўяўленне пра беларускі радыётэатр як мастацкі феномен краіны, што развіваецца ў непарыўнай сувязі з літаратурнай спадчынай.
**Ключавыя словы:** паэтычны радыётэатр, мастацкае вяшчанне, паэзія, радыёспектакль, радыёкампазіцыя, рэжысёр, рэдактар, Беларускае радыё.

***U. Trapianok,***
*PhD in Art History, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Directing of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## GENESIS AND MODERN DEVELOPMENT OF THE POETIC RADIO THEATRE OF BELARUS

**Abstract.** The article is devoted to the formation of the Belarusian poetic radio theater in the 1920s, its development under the influence of technological improvements of the state radio, and the identification of the peculiarities of the functioning of the audio phenomenon with a poetic literary basis at the modern stage. The main attention is paid to the formation and demand in different periods of the genres "poetic radio composition" and "radio performance". The factual material expands the idea of the Belarusian radio theater as an artistic phenomenon of the country, which develops in an inextricable connection with the literary heritage.
**Keywords:** poetic radio theater, art broadcasting, poetry, radio play, radio composition, director, editor, Belarusian Radio.

Стогадовая гісторыя Беларускага радыё (з 15 лістапада 1925 г.) непарыўна звязана з мастацкім вяшчаннем – музычным і літаратурным. Паэтычнае слова, якое адлюстроўвала духоўны свет сучасніка, яго адносіны да радзімы, працы і іншых людзей, прымянялася ў падрыхтоўцы перадач розных жанраў і форм – ад выканання верша ўнутры публіцыстычных праектаў да стварэння мноства самастойных паэтычных кампазіцый і радыёспектакляў, што дазваляе гаварыць пра асобны від радыётэатра Беларусі – паэтычны.

Паэтычны радыётэатр – гэта пастановачнае літаратурна-мастацкае аўдыяльнае вяшчанне, у аснову якога пакладзена вер-

шаваная літаратура. Паэтычны радыётэатр вызначаецца наяўнасцю творчай канцэпцыі (задумкі), якая рэалізуецца пры ўдзеле прафесійных выканаўцаў (акцёраў, дыктараў). Асноўнымі сродкамі мастацкай і тэхнічнай выразнасці з'яўляюцца слова, музыка, мантаж; часам могуць выкарыстоўвацца шумы, а таксама іншыя тэхналогіі для дасягнення неабходных акустычных эфектаў. Станаўленне беларускага паэтычнага радыётэатра адбывалася ў некалькі этапаў (развіцця і заціішша), падчас якіх фарміравалася жанравая разнастайнасць і перавага, практычна ўкараняліся выразныя сродкі.

Вершаванае слова выкарыстоўвалася ў нацыянальным радыёэфіры з першых месяцаў вяшчання. 11 красавіка 1926 г. прагучалі вершы П. Труса, А. Якімовіча, А. Дудара, Я. Пушчы і іншых беларускіх паэтаў, членаў літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Ужо ў пачатку студзеня 1928 г. ладзілася трансляцыя творчага вечара, прысвечанага беларускаму мастацтву, падчас якой слухачы мелі магчымасць пачуць вершы ў аўтарскім выкананні паэтаў Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага [1, с. 24–25]. Правобразам першых узораў жанру «паэтычная радыёкампазіцыя», які пазней стане запатрабаваным у паэтычным радыётэатры, былі выступленні ў радыёстудыі ў другой палове 1920-х гг. агітбрыгад з найменнем «Сіняя блуза», якія рыхтавалі для эфіру дынамічныя, палітычна-вострыя і разнастайныя падборкі, дзе чаргаваліся вершы і публіцыстычныя злабадзённыя тэксты з выкарыстаннем музыкі, у выніку чаго з'яўляліся паўнавартасныя мастацка-публіцыстычныя творы.

Усесаюзны радыёкамітэт з 1933 г. наладзіў курсы для падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі супрацоўнікаў вяшчання, у тым ліку радыёрэжысёраў [Там жа, с. 35], прафесійны ўзровень, мяркуем, удасканальвалі і супрацоўнікі Беларускага радыё. Рэдакцыі мясцовага вяшчання атрымлівалі з Масквы літаратурныя матэрыялы, што ўкаранялі ў сваім радыёэфіры. Тагачасны літаратурны аддзел Беларускага радыё, які быў адным з самых вялікіх, апрача асвятлення падзей, у прыватнасці, з першых Усесаюзнага і Усебеларускага з'ездаў пісьменнікаў, арганізацыі творчых вечароў літаратараў на радыё, трансляцый з тэатраў, займаўся стварэннем шматлікіх радыёкампазіцый (літаратурна-музычных мантажоў), у тым ліку паэтычных. Галоўнай задачай аддзела была прапаганда дасягненняў нацыянальнай літаратуры, а таксама «класічнай і прагрэсіўнай замежнай

літаратуры» [1, с. 53]. Так, у 1930-я гг. радыёслухачы мелі магчымасць пачуць творы А. Пушкіна, М. Лермантава, М. Някрасава, П.-Ж. дэ Беранжэ і інш.

З'яўленне ў другой палове 1930-х гг. радыёінсцэніроўкі па паэме Я. Купалы «Курган» [1, с. 55] сведчыць пра пашырэнне жанравага дыяпазону паэтычнага радыётэатра. Адзначым, што паэтычныя радыёспектаклі рыхтаваліся ў паралелі з пастаноўкамі з празаічнай асновай, большасць літаратурна-драматычных твораў з-за недастаткова развітой тэхнікі гуказапісу выходзіла ў прамым эфіры, таму іх падрыхтоўка з'яўлялася справай складанай і адказнай. У стварэнні літаратурна-драматычнага кантэнту былі задзейнічаны акцёры БДТ-1, а таксама ўдзельнікі спецыяльнай артыстычнай групы, якая існавала на Беларускім радыё ў 1930-я гг.

Стваральнікамі публіцыстычнага аўдыяльнага кантэнту з элементамі паэзіі ў гады Вялікай Айчыннай вайны былі пераважна беларускія паэты – з Масквы, адкуль вялося вяшчанне радыёстанцыі «Савецкая Беларусь», трансліраваліся словы Я. Купалы, Я. Коласа, П. Панчанкі, А. Куляшова, П. Броўкі, М. Танка, А. Бялевіча, А. Астрэйкі, М. Машары і інш. У якасці зброі ідэалагічнай барацьбы выкарыстоўваліся сатырычныя вершы. Надзвычай запатрабаванымі сталі радкі Я. Купалы «Партызаны, партызаны, беларускія сыны!», якія гучалі штодзённа перад запозненай дастаўкай апошніх паведамленняў [Там жа, с. 80–81]. У развіцці паэтычнага радыётэатра гэты перыяд быў гадамі зацішша.

У пасляваенны час у паэтычным радыётэатры Беларусі загучала радасць сустрэчы з роднай зямлёй, горыч ад страт і разбурэнняў – перадаваліся асобныя вершы «У родных мясцінах» Я. Коласа, «Зварот» П. Глебкі, «Родны горад» П. Броўкі, «Мы ў свой горад прыйшлі» М. Танка і інш., рыхтаваліся кампазіцыі для ўсіх узроставых катэгорый. Адной з галоўных тэм паэтычнага радыётэатра, для эфіру якога запрашаліся акцёры мінскіх тэатраў, стала паэтызацыя адбудовы роднага краю.

На Беларускім радыё ў сярэдзіне ХХ ст. быў канчаткова засвоены метад папярэдняй фіксацыі на магнітную плёнку, што адкрыла перад рэжысёрамі і гукарэжысёрамі паэтычнага радыётэатра новыя магчымасці, дазволіла ўкараняць на практыцы фармаўтваральныя (слова, музыка, шумы) і тэхнічныя (найперш мантаж) сродкі мастацкай выразнасці, што, у выніку, па-

высіла якасць і прывабнасць аўдыяльнага кантэнту. Дзякуючы запісу, да нашага часу захаваліся творы, якія з'яўляюцца ўзорамі тагачаснага мастацкага вяшчання, сфарміраванага на аснове твораў айчыннай, рускай, замежнай вершаванай літаратуры, і якія перыядычна выкарыстоўваюцца ў сучасным радыёэфіры. У якасці прыкладаў найвышэйшага ўзроўню радыётворчасці сярэдзіны XX ст. можна назваць паэтычныя радыёспектаклі «Цыганы» паводле аднайменнай паэмы А. Пушкіна ў перакладзе А. Куляшова (1952 г., выканаўцы – Б. Платонаў, З. Браварская, Б. Кудраўцаў, У. Кудрэвіч, І. Шаціла і інш.), «Рамэа і Джульета» У. Шэкспіра ў перакладзе К. Крапівы (1952 г., выканаўцы – Б. Платонаў, І. Ждановіч, іншыя артысты Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Купалы), «Новая зямля» па аднайменнай паэме Я. Коласа (1958 г., выканаўцы – Г. Глебаў, Л. Ржэцкая і інш.). У жанры «паэтычная радыёкампазіцыя» з'явіліся, у прыватнасці, творы «Толькі ўперад» паводле паэмы А. Куляшова (1950 г., выканаўцы – Л. Стасевіч, І. Шаціла, П. Пекур), «Рыбакова хата» па творы Я. Коласа (1952 г., выканаўцы – Л. Ржэцкая, Г. Глебаў і інш.).

Дасягненнем паэтычнага радыётэатра 1960-х гг. стаў радыёспектакль «Мікалай Дворнікаў» па паэме М. Танка. Як пісаў Я. Радкевіч, гэты твор атрымаў высокую ацэнку на Цэнтральным радыё [Там жа, с. 178]. Яшчэ адна паэма М. Танка «Янук Сяліба» ўвасоблена ў аднайменным паэтычным радыёспектаклі ў 1964 г. Матэрыял належыць да буйнейшых, ранніх і найбольш значных здабыткаў паэтычнага эпасу аб партызанскім руху на Беларусі. Аўтарам інсцэніроўкі і рэжысёрам радыёспектакля выступіла З. Браварская [2, с. 109]. Замежная класіка была прадстаўлена, у прыватнасці, радыёверсіяй спектакля «Каханне – не жарты» па п'есе П. Кальдэрона ў перакладзе П. Макаля (1967 г., выканаўцы – акцёры Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Коласа).

На працягу дзесяцігоддзяў з 1965 г. выходзіў радыёчасопіс «Паэзія», папярэднікам якога была перадача «10 мінут паэзіі» [1, с. 178]. Радыёчасопіс адкрываўся новымі вершамі вядомага паэта, затым слова давалася аўтару, які расказваў аб сваёй рабоце, пасля эстафету пераймалі акцёры, што ўвасаблялі паэтычныя вобразы вершаваных твораў. У другой палове XX ст. у якасці інтэрпрэтатараў паэзіі выступалі майстры тэатральнай сцэны Л. Рахленка, З. Стома, В. Тарасаў, З. Браварская, Р. Ян-

коўскі, Л. Давідовіч, В. Белахвосцік, М. Захарэвіч, І. Ражба, П. Дубашынскі і інш.

Новая версія радыёспектакля «Новая зямля» па аднайменнай паэме Я. Коласа створана на Беларускім радыё ў 1976 г. Аўтарам інсцэніроўкі выступіў А. Петрашкевіч, музыку напісаў кампазітар І. Лучанок, ролі выконвалі акцёры В. Тарасаў, Г. Гарбук, П. Дубашынскі, М. Захарэвіч, В. Лебедзеў, П. Пекур, А. Памазан і інш. Прадстаўнічы склад задзейнічаных у радыёспектаклі творцаў сведчыць пра высокі выканальніцкі ўзровень і прафесійны падыход да фарміравання ўсяго літаратурна-драматычнага вяшчання. Дарэчы, да класічнага твора народнага паэта Беларусі на дзяржаўным радыё звярталіся неаднаразова – у 1960–1980-я гг. агучваліся асобныя фрагменты паэмы, у 1994 г. запісаны аднайменны радыёсерыял, над увасабленнем якога, у прыватнасці, працавалі рэжысёр А. Курловіч, выканаўца А. Уладамірскі.

Прыкладам паэтычнага радыётэатра 1980-х гг. з’яўляецца кампазіцыя «Міхасёвы прыгоды» паводле аднайменнай паэмы Я. Коласа, над запісам якой у 1988 г. працавалі акцёры І. Лапцінскі, В. Кавалерава, Г. Кухальская, В. Кернажыцкая, А. Унукава, Н. Ваўчок, З. Паўлоўская. Сапраўднымі здабыткамі гэтага дзесяцігоддзя назавем радыёспектаклі «Хамуціус» (1981) паводле паэмы А. Куляшова і «Рыбакова хата» (1982) па творы Я. Коласа ў пастаноўцы С. Гурыч з удзелам акцёраў акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы. Творчы калектыў у 1984 г. быў удастоены Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры [2, с. 113]. Яшчэ адной значнай работай паэтычнага радыётэатра стаў спектакль «Родныя дзеці» па рамане ў вершах Н. Гілевіча (1989 г., рэжысёр – В. Анісенка, кампазітар – І. Лучанок, выканаўцы – В. Тарасаў, С. Станюта, П. Дубашынскі і інш.).

Радыёспектакль «Судны дзень Скарыны» па аднайменнай драматычнай паэме М. Арочкі, запісаны ў 1990 г., захаваў майстэрства акцёраў П. Дубашынскага, З. Белахвосцік, Л. Улашчанкі, В. Манаева і інш. У апошняе дзесяцігоддзе XX ст. для папулярызацыі вершаванага слова на Беларускім радыё былі створаны новыя перадачы, сярод якіх «Паэтычны радыётэатр», былі запісаны спектаклі «Яна і Я» (1996) па вершах Я. Купалы і «Крымскія санеты» (1996) паводле творчай спадчыны А. Міцкевіча. Праектам, які папулярызаваў творчасць беларускіх паэ-

таў розных пакаленняў – ад класікаў да сучаснікаў, стаў «Прыхільнікам прыгожага пісьменства». За некалькі гадоў яго існавання створаны дзясяткі кампазіцый, якія ўвайшлі ў фонды Беларускага радыё. Сярод іх – «На Беларусі Бог жыве» паводле вершаў У. Караткевіча, «Пры святле Нарачанскіх бяроз» паводле вершаў З. Марозава, «Не вынішчыць маю любоў» паводле творчасці А. Грачанікава (1995); «Парогі жыцця» паводле вершаў М. Танка, «Планіда маёй Беларусі» паводле вершаў В. Зуёнка, «Зорныя далі» паводле вершаў Я. Журбы (1996); «Сябе пачуць і зразумець» паводле Т. Бондар, «Жыву прыветам я людскім…» паводле вершаў Е. Лось (1997); «Недасяжны мой парог» паводле твораў В. Віткі, «Матчын дар» паводле вершаў А. Гаруна (1998); «Рунь дабраты» паводле вершаў В. Гардзея, «Зачараваны край» паводле твораў Я. Баршчэўскага (1999); «Апалены вашай пяшчотай» паводле вершаў Р. Барадуліна, «Адгукнуся адзінствам» паводле вершаў Р. Тармолы (2000); «Дзень добры, мама» паводле вершаў Я. Янішчыц (2001); «У маім сэрцы гукі» паводле вершаў Я. Лучыны (2002); «Мае грамнічныя шляхі» паводле творчасці А. Пісарыка (2005) і інш. У стварэнні кампазіцый бралі ўдзел акцёры мінскіх тэатраў і Беларускага радыё – У. Рагаўцоў, Г. Кухальская, Ф. Варанецкі, А. Гарцуеў, А. Уладамірскі, Л. Давідовіч, А. Лабуш, А. Шароў, А. Пастрэвіч, Н. Качаткова, Л. Улашчанка, В. Кернажыцкая, В. Шушкевіч, В. Галуза, У. Курган, А. Вінярскі і інш. Праект праіснаваў да пачатку 2000-х гг.

У 1990-я гг. запісваліся паэтычныя творы для дзяцей, у прыватнасці, фонды дапоўніў радыёспектакль «Пра дзеда Ая-яй і бабу Оё-ёй» (1996) паводле тэксту А. Лойкі з удзелам Г. Гарбука, З. Асмалоўскай, А. Шабад, С. Макарэя.

У XXI ст. адбыліся змены, звязаныя з рэарганізацыяй Беларускага радыё і адыходам ад ранейшай вяшчальнай палітыкі. Запатрабаваны ў мінулым жанр «радыёспектакль» замяніўся жанрам «радыёсерыял». Адзінкавым прыкладам стварэння паўнавартаснага паэтычнага спектакля можна назваць «Сымона-музыку» (2003) паводле аднайменнай паэмы Я. Коласа ў пастаноўцы рэжысёра В. Залатухіна, кампазітарам выступіў Л. Захлеўны, гукарэжысёр – А. Бублікаў, рэдактар – Г. Шаблінская. Ролі выконвалі акцёры Г. Аўсяннікаў, А. Памазан, В. Філатаў, Г. Давыдзька, А. Жук, А. Сідарава, Т. Баўкалава, А. Шароў і інш. У 2008 г. на канале «Культура» ў монавыкананні А. Ві-

нярскага прагучаў паэтычны радыёсерыял «Дон Жуан» Д. Байрана ў перакладзе на беларускую мову У. Скарынкіна.

Сучаснае развіццё паэтычнага радыётэатра вызначае стварэнне радыёкампазіцый, творчую канцэпцыю якіх фарміруе не рэжысёр, як гэта было да пачатку XXI ст., а рэдактар. Традыцыі жанру падтрымлівае праект «Дабравесце ад паэзіі» (рэдактар – Г. Шаблінская), які выходзіць на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. З 2009 г. запісаны дзясяткі вершаваных падборак, што актуалізуюць спадчыну айчынных паэтаў розных пакаленняў – Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, М. Танка, У. Караткевіча, П. Глебкі, П. Броўкі, К. Буйло, Я. Янішчыц, Р. Барадуліна, М. Мятліцкага, А. Пісьмянкова, Н. Мацяж, М. Аўрамчыка, К. Кірэенкі, У. Марука, Р. Баравіковай, В. Гардзея і інш. «Дабравесце ад паэзіі» прапануе серыі, кожная з якіх прысвечана выбранаму аўтару, чые вершы агучваюцца прафесійным акцёрам пад музыку, падабраную гукарэжысёрам запісу. На канале «Культура» па амаль такім жа прынцыпе запісваецца літаратурна-мастацкая перадача «Прачулым радком» (рэдактар – Н. Гальпяровіч), дзе на кожнага аўтара адводзіцца па дзве серыі праекта, што гучаць у суботу і нядзелю, таксама ў 2019–2023 гг. рыхтаваліся перадачы «Паэзія XXI стагоддзя» (па дзве серыі ў выхадныя) і «Адным штрыхом» (кожны штодзённы выпуск прапаноўваў 2–3 вершы аднаго беларускага паэта).

Такім чынам, засваенне радыёпрасторы Беларусі паэтычным словам адбылося ў другой палове 1920-х гг., у наступнае дзесяцігоддзе паэтычны радыётэатр канчаткова сфарміраваўся пасля выпуску паэтычных радыёспектакляў. У гады Вялікай Айчыннай вайны развіццё паэтычнага радыётэатра было прыпынена. Аднаўленне мастацкага кантэнту з вершаваным словам у аснове адбылося ў пасляваенны час. З'яўленне радыёзапісу пасадзейнічала фарміраванню фондаў і выхаду паэтычнага радыётэатра на новы творчы ўзровень, у якім да прафесіяналізму стваральнікаў мастацкіх твораў праз найноўшыя тэхнічныя магчымасці Беларускага радыё дадаўся шырокі арсенал сродкаў мастацкай выразнасці. У другой палове XX ст. створаны дзясяткі паэтычных радыёкампазіцый і радыёспектакляў, некаторыя з якіх сталі з'явамі ўсесаюзнага і нацыянальнага мастацтва.

Развіццё паэтычнага радыётэатра ў XXI ст. адбываецца пераважна за кошт стварэння аўдыяльных твораў рознага хронаметражу ў жанры «паэтычная радыёкампазіцыя». Адбыўся адыход ад «рэжысёрскага» радыётвора да «рэдактарскага», пры гэтым асноўная функцыя сучаснага паэтычнага радыётэатра засталася ранейшай і заключаецца ў папулярызацыі паэтычнай спадчыны Беларусі.


1. *Радкевіч, Я. Р.* Беларускае радыё: гісторыя, перспектывы развіцця / Я. Р. Радкевіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1983. – 197 с.

2. *Трапянок, У. А.* Спецыфіка развіцця радыётэатра ў медыяпрасторы Беларусі / У. А. Трапянок ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2019. – 208 с.



УДК 792.097+7.097



***Чжан Яньпен,***
*соискатель ученой степени кандидата наук учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск, Беларусь;*
***В. А. Трепенок,***
*кандидат искусствоведения, доцент, доцент кафедры режиссуры учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск, Беларусь*


## ВЛИЯНИЕ ЗАИМСТВОВАННЫХ ПРОГРАММ НА СОВРЕМЕННОЕ ТЕЛЕВИДЕНИЕ КИТАЯ НА ПРИМЕРЕ ПОСТАНОВОЧНОГО ПРОЕКТА «СЛАВА БОГУ, ТЫ ЗДЕСЬ»


**Аннотация.** Рассматривается практика локализации китайских современных постановочных телепроектов на основе заимствования зарубежных программных моделей. Путем анализа адаптированной передачи «Слава Богу, ты здесь» показывается, каким образом трансформировался современный китайский телетеатр, в каких условиях существуют актеры, как искусство импровизации, актуальность сценариев, участие судейской команды влияют на интерактивность и зрелищность телевизионного эфира. Исследование демонстрирует новое актуальное направление в развитии современного китайского телетеатра.



**Ключевые слова:** китайский телеспектакль, заимствование, адаптация, «Слава Богу, ты здесь», импровизация, постановочный проект, современный телетеатр.